СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!
Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі.

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 23 (754) | Субота, 22 красавіка | 1944 г.

ПРАЧЫТАЎ, ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

У ноч на 19 красавіка наша авіяцыя дальняга дзеяння зрабіла масіраваны налёт на чыгуначны вузел ЛЬВОЎ і бамбардыравала скапленні эшалонаў з войскамі і тэхнікай праціўніка. У выніку бамбардыроўкі ўзнікла да 40 пажараў, гарэлі эшалоны з узбраеннем і цыстэрны з гаручым. Пажары суправаджаліся сільнымі ўзрывамі. Полымя пажараў было відна на 150 км.

## УКАЗ

### Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

### АБ УЗНАГАРОДЖАННІ МАРШАЛА СОВЕЦКАГА САЮЗА ЖУКАВА Г. К. ОРДЭНАМ „ПОБЕДА"

За ўмелыя выкананні задання Вярхоўнага Галоўнакамандавання па кіраўніцтву баявымі аперацыямі вялікага маштаба, ў рэзультаце якіх дасягнуты выдатныя поспехі ў справе разгрома нямецка-фашысцкіх захопнікаў узнагародзіць ордэнам „Победа" Маршала Совецкага Саюза ЖУКАВА Георгія Канстанцінавіча.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль, 10 красавіка 1944 года.

## Захоплівайце ў ворага зброю

За час Айчыннай вайны Чырвоная Армія і партызаны нанеслі нямецка-фашысцкім акупантам многа цяжкіх удараў, якія паслабілі гітлераўскую армію і зараз яна пад ударамі нашых войск адкатваецца на захад, усцілаючы дарогі трупамі сваіх салдат і ваеннай тэхнікай.

Не шкадуючы ні сіл, ні жыцця свайго, народныя мсціўцы па баявому дапамагаюць фронту, бязлітасна громячы заклятага ворага ў яго тыле.

Партызанскія атрады нашага раёна за час свайго дзеяння нанеслі моцныя ўдары па акупантам і захапілі многа трафеяў.

На днях народныя мсціўцы атрадаў імя Р. і О., пад кіраўніцтвам камандзіраў атрадаў Александра Ф. і Уладзіміра Ш., камандзіраў падраздзяленняў Аляксея Маякіна, Александра Г. і начальніка штаба Сашы К., у вёсцы Лепяходы атакавалі групу гітлераўцаў, якія ішлі рабаваць і забіваць мірных жыхароў. Партызаны забілі і паранілі звыш 50 немцаў і паліцэйскіх. Праціўнік у паніцы ўцёк з поля боя, пакінуўшы 18 трупаў. Народныя мсціўцы захапілі 4 кулямёты, мінамёт, гранатамёт, 2 аўтаматы, многа вінтовак і боепрыпасаў.

Пытанні ўзбраення і папаўнення боепрыпасаў не павінны выпадаць з-пад увагі камандавання партызанскіх атрадаў. Трэба браць прыклад з тых партызанскіх атрадаў, якія навучыліся пры правядзенні баявых аперацый захопліваць у ворага ўзбраенне.

Таварышы партызаны! Смела ўступайце ў бой з гітлераўскімі бандытамі, бязлітасна знішчайце іх і захоплівайце ў ворага зброю, папаўняйце свае баявыя запасы; узбройвайце новых партызан, якія прыходзяць помсціць акупантам за учыненыя здзекі над нашым народам, авалодвайце трафейнымі кулямётамі, мінамётамі, аўтаматамі і вінтоўкамі. Біце подлых фашысцкіх гадаў іх-жа зброяй! Няхай на кожным кроку знойдуць сабе смерць гітлераўскія бандыты.

## З аператыўных зводак Совінформбюро

### (З 18-га ПА 22 КРАСАВІКА)

На плацдарме паўднёва-заходней г. Нарва нашы войскі паспяхова адбівалі атакі вялікіх сіл пяхоты і танкаў праціўніка. Толькі за 20-е красавіка ў баях знішчана да 2.000 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Заходней г. Тарнопаль нашы войскі вялі баі мясцовага значэння і занялі некалькі населёных пунктаў.

Паўднёва-ўсходней г. Станіслаў нашы войскі адбівалі атакі вялікіх сіл пяхоты і танкаў праціўніка. Толькі за 21-е красавіка знішчана 68 нямецкіх танкаў і забіта 1.500 салдат і афіцэраў праціўніка.

На Кішынёўскім напрамку нашы войскі працягвалі весці баі па расшырэнню плацдарма на правым беразе Днестра і палепшылі свае пазіцыі.

На Севастопальскім напрамку нашы войскі працягвалі весці наступальныя баі, авалодалі г. Балаклава і некалькімі насялёнымі пунктамі.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў.

За 4 дні баёў на ўсіх франтах падбіта і знішчана 175 нямецкіх танкаў, збіта 267 самалётаў праціўніка.

## Па Совецкаму Саюзу

У гэтым годзе школамі і курсамі пры МТС будзе падрыхтавана больш 300 тысяч механізатараў сельскай гаспадаркі, трактарыстаў, брыгадзіраў трактарных брыгад, камбайнёраў, шофераў і механікаў.

*** Калгасы Узбекістана сабралі для вызваленых раёнаў 200 тысяч авец і коз.

З БАЯВОГА ЖЫЦЦЯ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ

## Смеласць і рашучасць забяспечыла поспех

Па трывозе наш партызанскі атрад выступіў насустрач варожай жандармска-паліцэйскай групіроўцы, якая ішла рабаваць і забіваць сялян лясавых вёсак. Сустрэча з праціўнікам адбылася ў населеным пункце П., дзе немцы і паліцэйскія, уварвäўшыся ў яго як галодныя ваўкі, шнырылі па абгарэлых сялянскіх скляпох, шукалі сялянскай маёмасці.

Прыняўшы баявы парадак, мы адкрылі шквальны агонь па праціўніку. Больш 2-х гадзін ішла перастрэлка, ішоў бой з праклятымі гітлераўцамі, якія, засеўшы за склепамі, адстрэльваліся. Я прыняў рашэнне пайсці ў атаку. Пасля чаго група партызан начале з начальнікам штаба Сашай К. і камандзірам роты Александрам Г. пераправілася праз раку В., зайшла праціўніку з фланга, адкрыла па ім моцны агонь і кінулася ў атаку. У гэты-ж час мая група партызан атакавала праціўніка ў лоб.

Вораг не вытрымаў нашай атакі. Гітлераўцы кінуліся ў панічаскае бегства. Нашы байцы з клічам „за Совецкую Радзіму“, „за роднага Сталіна“, праследвалі ворага і з кулямётаў, аўтаматаў і вінтовак расстрэльвалі немцаў і паліцэйскіх.

Асаблівую адвагу і храбрасць у баю праявілі партызаны кулямётчыкі Нікалай Т., Барыс Б., Георгій Д., Андрэй І., Іван К., партызаны Нікалай А., Жорж Ш., Белы, Гігіядзе, Александр В., Галаваў, Сідарэнка, Гардзеенка і Паровін.

Партызан Нікалай А. забіў нямецкага афіцэра, забраў яго зброю і захапіў жывым яшчэ аднаго гітлераўца. Партызан комсамолец Жорж Ш., расстраляўшы кулямётны расчот, захапіў кулямёт.

У гэтым баю наша партызанскае падраздзяленне разам з групай партызан атрада імя О. забіла і параніла звыш 50 гітлераўцаў. Толькі на полі бою праціўнік пакінуў 18 трупаў немцаў і паліцэйскіх.

Намі захоплена 3 ручныя кулямёты, 14 дыскаў, мінамёт, 12 вінтовак, 2 аўтаматы, 4 пісталеты, многа патронаў і другой ваеннай маёмасці.

АЛЕКСАНДР Ф.,
камандзір атрада.

## Нашы кулі насцігалі гітлераўцаў

Наша падраздзяленне займала абарону на апушцы лесу. Вось паказалася вялікая група варожых салдат, яны падыходзілі к флангу нашай абароны. Я загадаў перамяніць пазіцыю. Мы прыблізіліся да фрыцаў на адлегласць 300 метраў, дзе завязаўся бой. Гітлераўцы залеглі ў руінах некалі іміж спаленай вёскі (многія з іх цяпер там знайшлі сабе магілу). З боку па іх вялі агонь партызаны другога атрада.

Пасля двухгадзіннага боя быў дан загад „У атаку!“ Грознай лавінай падняліся партызаны і кінуліся ўперад. Хоць п'яных фрыцаў і прыкрывалі кулямёты, але што можа стрымаць партызанскую атаку? Кідаючы зброю, на хаду скідаючы боты і адзежу, уцякалі гітлераўцы, але ад партызанскіх куль яны не ўцяклі. Звыш паўсотні нямецкіх гадаў зламылі свае паганыя галовы. Некаторых з іх фрыцы падабралі, а частку, у пераважнасці паліцэйскіх бобікаў, пакінулі ўгнайваць нашу зямлю.

Партызаны нашага падраздзялення захапілі ў ворага ручны кулямёт, 2 пісталеты, гранатамёт, вінтоўкі і другія трафеі.

Дысцыплінавана і адважна вялі сябе ў баявой абстаноўцы партызаны Франк Г., Голеў, Владзімір Г., Владзімір Г., Грыгорый Ш., Чарткоў, Міця Тарабаш, Паўлінскі.

А. МАНЯЛІН,
кам. роты атрада імя О.

## Праводжу сяўбу

Я памятаю, як некалькі год назад мы праводзілі яравую сяўбу ў дружнай калгаснай сям'і. Золатам каласіліся нашы палі, упрыгожвалі зямлю нівы і сенажаці.

Праклятыя немцы ўсё папалілі, растапталі. Адабралі ў нас зямлю, а пасля „надзялілі“ нас гэтай самай нашай зямлёй. Бач, якія добрыя. Але нас не ашукаеш.

Я цяпер праводжу сяўбу на сваім полі, дзякуючы партызанам, якія ахоўваюць нас і дапамагаюць нам. Я таксама дапамагаю сеяць суседзям.

Мы чакаем добрага ўраджаю і роднай Чырвонай Арміі, падахвай якой будзем яго ўбіраць.

З сваім хлебам-соллю я буду сустракаць гераічных чырвоных воінаў.

КАСТУСЬ В.,
селянін энскай вёскі.

---

## Выслужыўся

Да нямецкага каменданта прышоў адзін венгерскі журналіст і папрасіў паказаць яму сапраўднага рускага партызана.

Камендант сказаў пра гэта начальніку жандармерыі. Жандарм хацеў пахваліцца сваімі поспехамі перад журналістам і рашыў падсунуць венгерцу свайго агента. Ён выклікаў да сябе аднаго здрадніка з мясцовых жыхароў, апрануў яго пад партызана і загадаў яму называць сябе „начальнікам партызанскага атрада“, нібы разгромленага мясцовай жандармерыяй.

Венгерац быў вельмі задаволен адказамі „партызана“ і, расчуліўшыся, выказаў пажаданне:

—Ці не можна,—сказаў ён каменданту,—павесіць гэтага партызана ў маёй прысутнасці, каб я мог гэта сфатаграфіраваць і здымак надрукаваць у нашай газеце.

Камендант рашыў быць любезным да канца і загадаў павесіць здрадніка. Нягледзячы на яго енкі і крыкі, здраднік быў павешаны.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Выданне Гр...скага РК КП(б)Б Друкарня газеты „Сталінец“.